# Мая Радзіма – Беларусь

Дубік Ягор Аляксандравіч,
дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Гімназія г.Петрыкава”,
5 «А» клас

Красавіцкі ранак. Толькі скончыліся вясновыя канікулы. Мы, пяцікласнікі, гучна абменьваючыся ўражаннямі ад нядаўняга адпачынку, чакаем пачатку заняткаў. Вясёлы гоман у класе прыпыняе званок. Першы ўрок – мой любімы – урок беларускай мовы. Адчыняюцца дзверы, і, як заўсёды з усмешкай на твары, у клас уваходзіць наша настаўніца. Вітаецца і раптам звяртаецца да мяне, прапануе прыняць удзел у конкурсе сачыненняў “Мая Радзіма – Беларусь”. О! Для мяне гэта вялікі гонар і, канешне, яшчэ большая адказнасць! Тут патрэбна асаблівае натхненне! Таму адразу пасля заняткаў у школе, не адкладваючы, я вырашыў прайсціся па родным горадзе, таму што менавіта з яго для мяне і пачынаецца Радзіма.

Я вельмі люблю свой родны Петрыкаў! Тут нарадзіўся я і мае бацькі. Тут жывуць дзядуля і бабуля. Тут я адчуў, наколькі радасна і адказна быць старэйшым братам сваёй маленькай сястрычкі. Тут пайшоў у першы клас, сустрэў сяброў.

Петрыкаўшчына – унікальны куточак беларускага Палесся, які ў мінулым годзе адзначыў сваё пяцісотгоддзе. Гэта радзіма легендарнага Дзеда Талаша. Тут знаходзіцца нацыянальны парк “Прыпяцкі”. Штогод збірае тысячы гасцей міжнародны фестываль “Кліч Палесся”. Працуе адно з буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў краіны – “Петрыкаўскі горна-ўзбагачальны камбінат”, удзел у будаўніцтве якога прымаў і мой бацька. Лясы, палі, чароўная Прыпяць… Усё гэта мне блізкае, дарагое, горача любімае і роднае. Гэта мая Радзіма!

Радзіма для мяне – сям’я, дом, родная вуліца, двор і дзіцячая пляцоўка. Радзіма – гэта дарога, па якой я кожны дзень хаджу ў школу. Радзіма – гэта мае настаўнікі, урокі беларускай мовы, класны кіраўнік і сябры. Радзіма – гэта асаблівы пах бабуліных страў і позірк яе ласкавых вачэй. Радзіма – гэта на дзве галавы вышэйшы за мяне дубок, які мы з бацькам узгадавалі з маленькага жалудка, што ўпаў са старога дуба, некалі пасаджанага маім прапрадзедам. Радзіма – гэта бярозы на шляху да вёскі. Часам мне здаецца, што я ведаю кожную з іх: крыху пахілую, з самым тоўстым камлём і тую, дзе я знайшоў свой першы грыб. Радзіма – гэта зграйка вераб’ёў, якія аблюбавалі куст бэзу, што расце пад вокнамі нашай кватэры, і няспынна шчабечуць у ім. Радзіма – гэта бусел, які кожны год прылятае на месца, дзе калісьці была яго буслянка. Яна ўжо даўно разбурана нядобрым чалавекам, а бусел усё прылятае, год за годам, кожную вясну, праз тысячы кіламетраў, пераадольваючы шмат цяжкасцей, каб вярнуцца на месца свайго разбуранага гнязда, каб вярнуцца на сваю Радзіму. Таму што ён – сапраўдны патрыёт. Ён не шукае новую хату, не будуе яе і, галоўнае, не нясе крыўды на чалавека. Ён

проста ляціць дамоў, а мы яго чакаем. Мама гаворыць, што з прылётам гэтага бусла для яе пачынаецца вясна. Радзіма – гэта рэчка Прыпяць, дзе мы з дзядулем ловім рыбу. Дзядуля навучыў мяне адчуваць прыгажосць роднай прыроды, быць назіральным, умець заўважаць незвычайнае ў звыклым і паўсядзённым. Так, я ведаю, у якім лазовым кусце жыве сямейка дзікай качкі, дзе будуе плаціну бабёр, дзе робяць свае гнёзды ластаўкі-берагавушкі, дзе, схаваўшыся ў азярыне, сціпла даруюць сваю прыгажосць белыя лілеі.

Прыходзяць на думку словы дзядулі, якія ён сказаў падчас аднаго з нашых падарожжаў па Прыпяці: “Патрыётам чалавек нараджаецца, а потым кожны дзень зноў і зноў ім становіцца”. Сапраўды, пачуццё любові да Радзімы было ў мяне заўсёды. З самага дзяцінства я цвёрда ведаю: быць беларусам – гучыць годна! А як жа можна кожны дзень зноў станавіцца патрыётам?! Што дзядуля меў на ўвазе, я доўга не мог зразумець. Але сёння я з упэўненасцю магу сказаць, які сэнс укладзены ў гэтыя словы. З дня ў дзень станавіцца патрыётам – гэта шчыра радавацца за сябра, які атрымаў перамогу ў спартыўных спаборніцтвах. Гэта адчуць светлы сум пасля сустрэчы з першым настаўнікам. Гэта адначасова плакаць і смяяцца, калі з тваёй далоні ў сваё першае знаёмства з небам паляцела выратаванае табою стрыжаня. Гэта чуць развітальны клёкат буслоў у жнівеньскім небе і, быццам падбадзёрваючы, махаць ім услед рукой. Гэта, калі нешта балюча сціскаецца ў грудзях, калі чуеш пра пакутную Хатынь і няскораную Брэсцкую крэпасць, Гэта бязмежны гонар, калі трымаеш у руках баявы медаль свайго прапрадзеда, які мужна, аддана і самаахвярна змагаўся з ворагам у гады Вялікай Айчынный вайны.

… Чысты ліст белай паперы. Старанна, з пачуццём вялікай гордасці, літара за літарай я выводжу першыя словы свайго сачынення: “Мая Радзіма – Беларусь”!